ПЕРШЫ этап абласной алімпіяды
па вучэбных прадметах
вучняў IV – IX класаў 2025/2026 навучальнага года

Першы этап абласной алімпіяды па вучэбных прадметах вучняў IV – IX класаў (далей – алімпіяда) праходзіць у наступныя тэрміны:

14.03.2026, 10.00 –

“Руская мова” і “Руская літаратура” – сярод вучняў IV-VIII класаў;

“Матэматыка” – сярод вучняў IV-VII класаў;

“Фізіка” – сярод вучняў VII-VIII класаў;

“Інфарматыка” – сярод вучняў I-IX класаў (у трох узроставых групах I-IV, V-VII, VIII-IX);

“Працоўнае навучанне” – сярод вучняў V-VI, VII-VIII класаў (сярод юнакоў і дзяўчат);

“Хімія” – сярод вучняў VII-VIII класаў;

“Геаграфія” – сярод вучняў VI-VIII класаў;

“Англійская мова” – сярод вучняў V-IX класаў,

21.03.2026, 10.00 –

“Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” – сярод вучняў IV-VIII класаў;

“Сусветная гісторыя”, “Гісторыя Беларусі” – сярод вучняў V – IX класаў;

“Грамадазнаўства” – сярод вучняў IX класаў;

“Біялогія” – сярод вучняў VI-VIII класаў;

“Кітайская мова” – сярод вучняў V-IX класаў;

“Фізічная культура і здароўе” – сярод вучняў VI-VII, VIII-IX класаў.

АРГАНІЗАЦЫЙНы КАМІТЭТ
па падрыхтоўцы і правядзенні першага этапу абласной алімпіяды па вучэбных прадметах вучняў IV – IX класаў

| | |
|---|---|
| Бярыдзэ А.А., | дырэктар гімназіі, старшыня камітэта; |
| Раманоўская Г.М., | намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце, намеснік старшыні камітэта; |
| Казачэнка А.А., | намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, член камітэта; |
| Міхасёва Ю.А., | кіраўнік вучэбна-метадычнага аб’днання настаўнікаў вучэбнага прадмета “Англійская мова”, член камітэта; |

| | |
|---|---|
| Бабовіч Н.У., | кіраўнік вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў пачатковай школы, член камітэта. |
| Юніцкі А.С., | кіраўнік вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў фізічнага, эстэтычнага і працоўнага навучання, член камітэта; |
| Сулімава Н.М., | кіраўнік вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў вучэбных прадметаў “Матэматыка”, “Фізіка”, “Інфарматыка”, член камітэта; |
| Зайцава А.В., | кіраўнік вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў вучэбных прадметаў “Біялогія”, “Геаграфія”, “Гісторыя”, “Хімія”, член камітэта; |
| Шульжэнка Л.А., | кіраўнік вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў вучэбных прадметаў “Руская мова” і “Руская літаратура”, “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”, член камітэта. |

Дадатак 2
да загада дырэктара гімназіі
ад 2026 №

САСТАЎ ЖУРЫ
першага этапу абласной алімпіяды
па вучэбных прадметах вучняў IV – IX класаў

| Вучэбны прадмет | Старшыня журы | Члены журы |
|---|---|---|
| **14.03.2026** | | |
| “Руская мова” і “Руская літаратура” (IV класы) | Бабовіч Н.У. | Валіт Т.М., Міхеева К.А. |
| “Руская мова” і “Руская літаратура” (V – VIII класы) | Шульжэнка Л.А. | Зайцава Н.І., Мураль А.С. |
| “Матэматыка” (IV класы) | Бабовіч Н.У. | Шэраш Г.Л., Алясюк Л.В. |
| “Матэматыка” (V-VII класы) | Сулімава Н.М. | Баканоўская Г.А., Буян Т.М. |
| “Фізіка” (VII, VIII класы) | Сулімава Н.М. | Барэйка Л.М., Прахоменка Ф.Ц. |
| “Інфарматыка” (I – IX класы) | Сулімава Н.М. | Голік А.А., Баразна С.М. |
| “Працоўнае навучанне” (V – VI, VII – VIII класы) | Юніцкі А.С. | Дзялец Л.У., Кунін Л.В. |
| “Англійская мова” (V – IX класы) | Міхасёва Ю.А. | Міронава В.В., Нгуен А.Л. |
| “Хімія”(VIII класы) | Зайцава А.В. | Ягорава Т.М., Назаранка К.С. |
| “Геаграфія” (VI – VIII класы) | Зайцава А.В. | Бараноўска Н.В., Курака М.Я. |
| **21.03.2026** | | |
| “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” (IV класы) | Бабовіч Н.У. | Лаеўская Н.М., Брулевіч А.Л. |
| “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” (V – VIII класы) | Шульжэнка Л.А. | Лявоненка В.Л., Яўсеенка В.В., |

| | | |
|---|---|---|
| “Сусветная гісторыя”, “Гісторыя Беларусі” (V – IX класы) | Зайцава А.В. | Курака Н.Я., Лявончанка І.В. |
| “Грамадазнаўства” (IX класы) | Зайцава А.В. | Курака Н.Я., Цурганава Л.І. |
| “Біялогія” (VII – VIII класы) | Зайцава А.В. | Халадок А.В., Назаранка К.С. |
| “Кітайская мова” (IV – IX класы) | Міхасёва Ю.А. | Нгуен А.Л., Цімашэнка В.І. |
| “Фізічная культура і здароўе” (VI-VII, VIII-IX класы) | Юніцкі А.С. | Несцяровіч І.У., Маісеенка М.У. |

Дадатак 3
да загада дырэктара гімназіі
ад 2026 №

ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ
першага этапу абласной алімпіяды
па вучэбных прадметах вучняў IV-IX
класаў у 2026 годзе

Першы этап абласной алімпіяды па вучэбных прадметах вучняў IV-IX класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі (далей – алімпіяда) праводзіцца ў дзяржаўнай установе адукацыі “Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа” з мэтай ранняга выяўлення і развіцця інтэлектуальнага патэнцыялу вучняў, арганізацыі іх сістэмнай прадметнай падрыхтоўкі.

**Тэрмін правядзення**

Першы этап алімпіяды праводзіцца у наступныя тэрмін з 14.03.2026 па 21.03.2026.

**Прадметы, час, колькасць тураў, форма і працягласць правядзення**

Першы этап алімпіяды праводзіцца па наступных вучэбных прадметах і ў наступны час:

14.03.2026, 10.00 –

“Руская мова” і “Руская літаратура” – сярод вучняў IV-VIII класаў;

“Матэматыка” – сярод вучняў IV-VII класаў;

“Фізіка” – сярод вучняў VII-VIII класаў;

“Інфарматыка” – сярод вучняў I-IX класаў (у трох узроставых групах I-IV, V-VII, VIII-IX);

“Працоўнае навучанне” – сярод вучняў V-VI, VII-VIII класаў (сярод юнакоў і дзяўчат);

“Хімія” – сярод вучняў VII-VIII класаў;

“Геаграфія” – сярод вучняў VI-VIII класаў;

“Англійская мова” – сярод вучняў V-IX класаў, (асобна для вучняў IV класаў)

21.03.2026, 10.00 –

“Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” – сярод вучняў IV-VIII класаў;

“Сусветная гісторыя”, “Гісторыя Беларусі” – сярод вучняў V – IX класаў;

“Грамадазнаўства” – сярод вучняў IX класаў;

“Біялогія” – сярод вучняў VI-VIII класаў;

“Кітайская мова” – сярод вучняў V-IX класаў;

“Фізічная культура і здароўе” – сярод вучняў VI-VII, VIII-IX класаў.

Першы этап алімпіяды праводзіцца ў адзін тур па асобных алімпіядных заданнях (за выключэннем вучэбных прадметаў, “Працоўнае навучанне”, “Кітайская мова”, “Фізічная культура і здароўе”).

Па вучэбным прадмеце “Фізічная культура і здароўе” алімпіяда праводзіцца ў два туры: першы тэрэтычны, другі – практычны, які ўключае тэсціраванне ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці.

Па вучэбным прадмеце “Працоўнае навучанне” заданні прадастаўляюцца для юнакоў і дзяўчат кожнай узроставай групы: V – VI (малодшая група), VII – VIII (старэйшая група). Алімпіяда выконваецца ў два туры: першы – тэарэтычны, другі – практычны (пры выкананні заданняў тэарэтычнага тура, удзельнікі пераходзяць ў майстэрні).

Па вучэбным прадмеце “Кітайская мова” работа выконваецца па адзіных заданнях для вучняў V – IX класаў; па інфарматыцы заданні выконваюцца ва ўзроставых групах I – IV класы (малодшая група), V– VII класы (сярэдняя група), VIII – IX класы (старэйшая група).

Па ўсіх вучэбных прадметах, акрамя вучэбнага прадмета “Інфарматыка”, алімпіядныя заданні выконваюцца і афармляюцца ў пісьмовай форме.

Па вучэбным прадмеце “Інфарматыка” работы вучнямі выконваюцца на платформе dl.gsu.by.

Заданні па вучэбных прадметах “Матэматыка”, “Фізіка”, “Хімія” выконваюцца ў праштампаваных лістах, па ўсіх астатніх вучэбных прадметах пісьмовыя адказы выконваюцца на бланках заданняў.

Працягласць работы над заданнямі вучняў:

IV класаў – да 1 г.;

V – VI класаў – да 1,5 г.;

VII класаў – да 2 г.;

VIII – IX класаў – да 2,5 г.;

V – IX класаў – “Кітайская мова” – да 2 г.;

V – VI класаў – “Працоўнае навучанне” – да 2 г.;

VII – VIII класы – “Працоўнае навучанне” – да 2,5 г.;

VII – IX класы – “Фізічная культура і здароўе” – да 2 г.;

I – XI класы – “Інфарматыка” – да 5 г.

**Склад удзельнікаў**

У першым этапе алімпіяды прымаюць удзел усе жадаючыя вучні I-IX класаў гімназіі, згодна з заяўкай, якую ў электронным выглядзе фарміруюць класныя кіраўнікі.

**Кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем першага этапу алімпіяды.**

Агульнае кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем першага этапу алімпіяды ажыццяўляе аргкамітэт, які фарміруецца адміністрацыяй гімназіі.

**Аргкамітэт першага этапу:**

стварае ўмовы для захавання алімпіядных заданняў, адказаў на алімпіядныя заданні, работ удзельнікаў першага этапу алімпіяды;

распрацоўвае схему рассадкі ўдзельнікаў першага этапу алімпіяды ў аўдыторыях;

вызначае колькасць тураў, форму і працягласць правядзення кожнага з іх;

фарміруе і зацвярджае склад журы;

распрацоўвае і зацвярджае праграму правядзення першага этапу рэспубліканскай алімпіяды;

прымае заяўкі на ўдзел у першым этапе рэспубліканскай алімпіяды;

узнагароджвае пераможцаў;

ажыццяўляе аналіз вынікаў правядзення перашага этапу і прадастаўляюць справаздачу ў аргкамітэт наступнага этапу;

фарміруе каманды для ўдзелу ў наступным этапе рэспубліканскай алімпіяды з ліку пераможцаў першага этапу;

забяспечвае апавяшчэнне ўдзельнікаў алімпіяды аб папярэдніх выніках (колькасці балаў, якія набраў удзельнік) першага этапу алімпіяды.

**Парадак правядзення першага этапу алімпіяды.**

Алімпіядныя заданні тыражыруюцца ў колькасці, якая адпавядае заяўкам, накіраваным у арганізацыйны камітэт.

Пакеты с заданнямі ўскрываюцца педагагічнымі работнікамі, якія суправаджаюць правядзенне алімпіяды ў аўдыторыях у прысутнасці вучняў – удзельнікаў алімпіяды. Адказныя за суправаджэнне забяспечваюць алімпіяднымі заданнямі кожнага ўдзельніка.

Педагагічныя работнікі, адказныя за правядзенне тура алімпіяды, правяраюць удзельнікаў па схеме рассадкі. Перасадзіць удзельнікаў першага этапу дазваляецца па ўзгадненні з прадстаўніком аргкамітэта.

Час для выканання алімпіядных заданняў адлічваецца з моманту давядзення тэкстаў заданняў да ўдзельнікаў першага этапу алімпіяды. На тытульным лісце (праштампаваны ліст) паперы ўдзельнік алімпіяды адзначае клас, сваё прозвішча, імя, імя па бацьку і прозвішча, імя, імя па бацьку свайго педагога. На першым лісце ўдзельнікамі не робяцца ніякія адзнакі. Работа выконваецца на другім лісце ці на лістах с заданнямі, дзе удзельнік не робіць ніякіх іншых адзнак, акрамя адказаў на пытанні. Пры невыкананні дадзенай умовы работы не правяраюцца і не ацэньваюцца. Вучням прадастаўляецца ліст для чарнавіка.

Удзельнікам алімпіяды дазваляецца ўносіць папраўкі ў сваю работу. Выпраўленні за памылкі не лічацца.

Пасля заканчэння выканання заданняў першага этапу алімпіяды ўдзельнікі здаюць свае работы настаўніку, адказнаму за суправаджэнне алімпіяды. У сваю чаргу адказныя за правядзенне тура перадаюць работы члену арганізацыйнага камітэта.

Не дазваляецца ўдзельнікам у працэсе выканання работ мець пры сабе сучасныя сродкі сувязі.

**Парадак шыфравання і дэшыфравання работ удзельнікаў першага этапу алімпіяды**.

Шыфраванне работ удзельнікаў першага этапу алімпіяды ажыццяўляе член аргкамітэта пасля выканання і здачы работ усімі ўдзельнікамі алімпіяды. Падчас шыфравання кожнаму ўдзельніку прысвойваецца ідэнтыфікацыйны нумар, які заносіцца на першы і другі ліст работы. Пасля гэтага работа перадаецца на праверку ў журы алімпіяды.

За забеспячэнне прыватнасці ідэнтыфікацыйных нумароў нясе адказнасць член аргкамітэта.

Дэшыфраванне работ удзельнікаў праводзіцца членам аргкамітэта пасля завяршэння работы журы па іх ацэньванні.

**Парадак работы журы.**

Склад журы на першым этапе фарміруецца, па магчымасці, з ліку спецыялістаў. Журы ўзначальвае старшыня.

Колькасны склад журы на першым этапе алімпіяды ўстанаўліваецца ў складзе не менш 3 чалавек.

Журы перашага этапу алімпіяды:

зацвярджае крытэрыі ацэньвання вынікаў выканання алімпіядных заданняў;

правярае і ацэньвае выкананне алімпіядных заданняў;

разгледжвае звароты ўдзельнікаў па пытаннях, якія ўзніклі ў іх па выніках ацэньвання выкананых імі заданняў;

інфарміруе ўдзельнікаў аб выніках іх удзелу;

вызначае пераможцаў першага этапу алімпіяды.

Старшыня журы размяркоўвае членаў журы для ацэньвання алімпіядных заданняў удзельнікаў першага этапу. Праверка выканання алімпіядных заданняў ажыццяўляецца не пазней чым праз дзень пасля правядзення тура.

Вынікі ацэньвання афармляюцца на апошнім лісце работы вучня. Кожны член журы падцвярджае вынікі ацэньвання сваім подпісам. Вынікі праверкі заносяцца ў пратакол. Правераныя работы перадаюцца старшыні журы.

**Парадак азнаямлення ўдзельнікаў з вынікамі ацэньвання алімпіядных заданняў і разгляд журы зваротаў удзельнікаў па пытаннях ацэньвання выкананых імі алімпіядных заданняў.**

Удзельнікі алімпіяды маюць права ў вызначаны аргкамітэтам час паглядзець свае работы, задаць пытанні, калі яны паўсталі.

Пры нязгодзе ўдзельніка з ацэнкай яго работы, ён мае права падаць зварот на імя старшыні арганізацыйнага камітэта аб пераглядзе ацэньвання.

Пры неабходнасці праводзіцца пасяджэнне журы, на якім прымаецца канчатковае рашэнне па ацэньванні адпаведнага алімпіяднага задання. Складаецца адпаведны акт.

Настаўнікі і законныя прадстаўнікі вучняў не маюць права прымаць удзел ў працэсе азнаямлення з вынікамі ацэньвання алімпіяднай работы

**Парадак запаўнення пратаколаў першага этапу**

Запаўненне пратаколаў здзяйсняецца членамі журы ў электронным выглядзе па выніках праверкі алімпіядных заданняў пасля дэшыфравання работ.

**Падвядзенне вынікаў першага этапу рэспубліканскай алімпіяды**

Па выніках правядзення перашага этапу алімпіяды выдаецца загад, які даводзіцца да ведама педагагічных работнікаў гімназіі.

Колькасць пераможцаў першага этапу алімпіяды складае не больш 30% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў па кожным вучэбным прадмеце па паралелях (узроставых групах) пры ўмове выканання алімпіядных заданняў не менш, чым на 30%. У выпадку выканання заданняў менш 30 % пытанне аб размеркаванні дыпломаў вырашаецца большасцю галасоў журы, аб чым робіцца дадатковы запіс у пратаколе. Калі колькасць вучняў у паралелі, якія ўдзельнічалі ў алімпіядзе, менш 7 чалавек па кожным прадмеце, то пераможцамі становяцца 3 чалавекі ў кожнай паралелі, якія набралі найбольшую колькасць балаў. Пераможцы ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені. Колькасць дыпломаў I ступені не павінна перавышаць 20 % ад колькасці пераможцаў, II ступені – 30%, III ступені – 50 %. Колькасць дыпломаў зацвярджаецца журы і вызначаецца ў пратаколе.

Пры ўзнікненні спрэчных пытанняў рашэнне прымае старшыня журы першага этапу алімпіяды.

На другі этап алімпіяды накіроўваюцца вучні, якія сталі пераможцамі першага этапу (па агульным рэйтынгу), у адпаведнасці з квотай, устаноўленай загадам упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама.